Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ВЕРАСНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 169 (28279)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



У сталіцы — Дзень горада СТАР. 3



Новае жыццё старога манастыра СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

# РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## Дзяржава павінна зрабіць усё магчымае, каб дзеці з асаблівасцямі развіцця не адчувалі сябе лішнімі ў грамадстве



Фота БЕЛТА.

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас наведвання спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната №13 горада Мінска для дзяцей з парушэннем слыху.**

«Я вельмі шмат разоў бываў у падобных школах. Але сёння ўпершыню для сябе адкрыў такую рэч: ніякія вы не інваліды ці людзі з абмежаванымі здольнасцямі і магчымасцямі. Вы такія ж, як і мы, проста трошачкі адрозніваецеся ад нас, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да выхаванцаў школы-інтэрната. — Хоць я і гэта стаўлю пад сумненне, убачыўшы тое, што вы сёння можаце. І самае галоўнае, што вы свабодна маеце зносіны са сваімі выкладчыкамі і адзін з адным».

«Вядома, нас турбуе, які вы далей выберацe шлях і як ён складзецца. Я вам абяцаю, што тут праблем у вас не будзе, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы дамовіліся, што ўрад яшчэ раз вывучыць праблему занятасці, каб вы ўсе знайшлі свае месца ў жыцці, каб маглі працаваць і зарабляць для сябе і сваіх дзяцей».

СТАР. 2

# МІР У РУКАХ

**Першы навучальны дзень для школьнікаў усёй краіны пачаўся з урока «Нам мір завешчана берагчы». У школах Гродна ў гэты дзень вучні зрабілі больш за 110 тысяч сімвалаў міру — папяровых галубоў. Дапамагалі дзецям у вырабе беласнежных птушак не толькі настаўнікі, але і запрошаныя госці, вядомыя людзі рэгіёна.**



Фота БЕЛТА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня прэзідыума НАН:**

*«Таленавітыя маладыя даследчыкі знаходзяць падтрымку ў сваіх пачынаннях. Яны замацаваны за вядучымі вучонымі краіны, у іх ёсць магчымасць працаваць у перадавых лабараторыях навуковых арганізацый НАН Беларусі. Для маладых навукоўцаў прадугледжана сістэма даплат, маюцца розныя прэміі. У тых, хто паспяхова абараніўся, ёсць выдатныя магчымасці для кар'еры. Зараз у НАН Беларусі прапрацоўваецца сістэма мер па заахвочванні тых, хто абараніў кандыдацкія дысертацыі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9613 | ▲ |
| Еўра | 2,1846 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0300 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0734 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

Лілія АНАНІЧ:

# «Захаваць увагу да кнігі здольная найперш... сама кніга»

ХХІІІ ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА РАГАЧОЎ 2016

**Першыя восеньскія выхадныя ўжо каторы год праходзяць у краіне пад знакам Дня беларускага пісьменства. Яно і не дзіва: самая лепшая пара для творчасці, як вядома, восень, дый першая кніга Скарыны ў далёкім 1517-м пабачыла свет якраз у гэты час — на мяжы лета і восені... Сёлета свята ўпершыню прымае Рагачоў, старажытны горад з непаўторнай аўрай, зямля, якая натхняла Макаёнка і Караткевіча. Пра падарункі гораду і натхненне, пра новыя кнігі і тое, як іх папулярызаваць, пра 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, якое будзем адзначаць налета, мы гаварылі наконадні свята пісьменства з міністрам інфармацыі Ліліяй АНАНІЧ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Лілія Станіславаўна, ужо традыцыйна ў краіне штогод праходзяць два знакавыя мерапрыемствы, прысвечаныя, скажам так, прыгожаму пісьменству ўвогуле, — Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш у лютым і Дзень беларускага пісьменства ў верасні. Скептыкі заўважаюць: ці не занадта для нашай невялікай краіны два такія прадстаўнічыя форумы з падобнай тэматыкай на год?.. Давайце патлумачым ім і ўсім астатнім чытачам, у чым жа прынцыповае адрозненне гэтых мерапрыемстваў.***

— Пачнём усё-ткі з таго, што іх аб'ядноўвае. І ў лютым, і ў верасні на названыя мерапрыемствы збіраюцца людзі, якія маюць цікавасць да кнігі, да мастацкага слова, да літаратуры. І з гонарам можна адзначыць, што такіх людзей у нашай краіне шмат, магчыма, менавіта таму замежныя госці з радасцю прымаюць запрашэнне далучыцца да гэтых важных падзей у культурным жыцці Беларусі і паўдзельнічаць у іх.

Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш, якая традыцыйна праходзіць менавіта ў сталіцы, — гэта кніжны форум, практыка правядзення якіх існуе і ў іншых краінах. Тут можна прыгадаць Маскоўскую выставу-кірмаш (дарэчы, яна адбудзецца ў верасні і актыўны ўдзел у ёй прымуць і беларускія выдавецтвы), і выставу ў Франкфурце — найбуйнейшую ў свеце (туды мы толькі пракладваем дарогу). Кожны раз гэта своеасаблівы агляд кнігавыдавецкай галіны розных краін, падчас якога выдаўцы, пісьменнікі і чытачы маюць пляцоўку для шчырай размовы і абмену досведам... Магу адказна зазначыць: Мінскі кніжны форум выглядае вельмі годна і па арганізацыі, і па прадстаўніцтве: сёлета ў ім прынялі ўдзел прадстаўнікі амаль двух дзясяткаў краін.

СТАР. 4

# РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ёсць факты, калі кіраўнікі арганізацый не хочуць браць на працу маладых людзей з асаблівасцямі развіцця. «Мне канкрэтных фактаў не назвалі, але кажуць, яны ёсць. Мы абавязкова знойдзем і ліквідуем гэтыя бар'еры. Таму што мы не можам не падтрымліваць вас, якія так моцна імкнуцца ў гэтае жыццё», — адзначыў беларускі лідар.

Наведваючы школу-інтэрнат, Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы адукацыі, умовамі навучання, выхавання і пражывання навучэнцаў. Прэзідэнту далажылі аб гатоўнасці ўстаноў адукацыі да новага навучальнага года і развіцці спецыяльнай адукацыі ў Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што не лічыць прафесію выкладчыка непрэстыжнай або нецікавай. «Выкладчык — гэта вяршыня, самая цікавая праца», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым, лічыць Прэзідэнт, педагогам неабходна падняць зарплату. Рабіць гэта трэба пераважна за кошт рэзерваў у самой сістэме адукацыі. «Ва ўрадзе, як дамаўляліся, ужо зрабілі крок, таму давайце паспрабуем на працягу кароткага часу падняць зарплату настаўнікам. Але першая мая ўмова: сістэму адукацыі трэба цалкам аптымізаваць, пачынаючы ад Міністэрства адукацыі і заканчваючы школай, але не на шкоду дзецям», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама прысутнічаў на святочным канцэрце да Дня ведаў, падчас якога выступілі калектывы Ізабелінскай школы-інтэрната і ўдзельнікі дзіцячага тэатра пантамімы «Спадарожнік» і студыі жэставай песні «Гаваркія рукі», паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Пасля мерапрыемства выхаванцы школы-інтэрната ўручылі Аляксандру Лукашэнку памятны падарунак.

Першакласнікам ад Прэзідэнта перадалі вучэбныя дапаможнікі «Беларусь — наша Радзіма», а школе — шматфункцыянальную інтэрактыўную панэль вытворчасці ААТ «Гарызонт», аснашчаную спецыяльнымі навучальнымі праграмамі для работы з дзецьмі з парушэннямі слыху.

## Званіце, вас пачуюць

Па традыцыі ў суботу, 3 верасня, пройдуць прамыя тэлефонныя лініі. На званкі жыхароў краіны адкажуць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны пастараюцца знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый.

**З 9.00 да 12.00 на пытанні будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам:** намеснік старшыні Клец Андрэй Анатолевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам:** намеснік старшыні Аскерка Віктар Віталевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам:** старшыня Савета дэпутатаў Барысенка Алег Леанідавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам:** намеснік старшыні Шулейка Юрый Вітольдавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам:** кіраўнік спраў Варонін Рыгор Аляксандравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам:** намеснік старшыні Сірэнка Віктар Іванавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам:** намеснік старшыні Бірыч Жанна Эдуардаўна (80172224444).

■ Дзень ведаў

## У рэгіёнах — як у сталіцы

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр КОСІНЕЦ 1 верасня наведаў сярэднюю школу №1 Фаніпаля. Напярэдадні ўрачыстай лінейкі, прысвечанай пачатку навучальнага года, ён заявіў журналістам, што для школьнікаў павінны быць створаны роўныя ўмовы ва ўсіх кутках нашай краіны.**

«Мы будзем імкнуцца да таго, каб не было адрозненняў у якасці адукацыі, ва ўзроўні падрыхтоўкі дзяцей, развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ў сталіцы і рэгіёнах, — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Таленты ў нас ёсць усюды, мы проста павінны іх развіваць. Дзіця не вінавата, што нарадзілася не ў Мінску, а, напрыклад, у Фаніпалі. Яму трэба стварыць роўныя ўмовы, каб яно праявіла свой інтэлектуальны патэнцыял, а для гэтага трэба граматна развіваць сістэму адукацыі ў розных кутках Беларусі, суправаджаць яе кадравым забеспячэннем, выяўляць таленты і весці іх па жыцці».

Аляксандр Косінец звярнуў увагу, што школа ў Фаніпалі — добры прыклад таго, што і ў маленькіх гарадах якасць адукацыі не саступае сталічнай. Тут працуе больш за 85 педагогаў, 70% з іх маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Матэрыяльная база школы таксама не саступае сталічным навучальным установам, а вучні становяцца пераможцамі розных алімпіяд і спаборніцтваў. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта растлумачыў, што выбраў менавіта гэтую школу для наведвання ў Дзень ведаў, каб паказаць, што роўныя ўмовы для школьнікаў сапраўды ствараюцца па ўсёй краіне.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## Кваліфікацыя адкрывае перспектывы

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ у Дзень ведаў прыехаў у дзяржаўны прафесійны ліцэй №5 транспартнага будаўніцтва.**

— Цяпер у краіне існуе дэфіцыт кваліфікаваных рабочых кадраў, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Таму сістэма прафесійна-тэхнічнай падрыхтоўкі спецыялістаў мусіць быць у прыярытэце. Тым больш што калі мы кажам, што адукацыя працягваецца ўсё жыццё, то трэба даваць магчымасць таго, каб маладыя людзі паспрабавалі сябе на першых прыступках прафесійнай падрыхтоўкі. Гэта ні ў якім разе не прыніжае адукацыю вышэйшую: той, хто хоча, можа яе атрымаць. Але з ужо атрыманай кваліфікацыяй чалавек будзе абаронены ў сацыяльным плане — атрымае прафесію, запатрабаваную на рынку працы.

Нягледзячы на існуючыя стэрэатыпы, выхаванцы прафесійна-тэхнічных устаноў адукацыі дэманструюць высокі ўзровень ведаў і падрыхтоўкі не толькі на рэспубліканскім, але і сусветным узроўні. Гэта пацвярджаецца тым, што сярод навучэнцаў ліцэя №5 шмат удзельнікаў міжнародных алімпіяд і спаборніцтваў.

— Наведваючы прадпрыемствы будаўнічага комплексу і машынабудаўніцтва, заўважаеш, што сённяшні рабочы — гэта не той, які быў 20—30 гадоў таму, — лічыць старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта высокакласны спецыяліст, здольны працаваць на сучасным абсталяванні. Але каб яго гэтаму навучыць, патрэбен і добра кваліфікаваны педагог. А вось з імі справа не зусім простая. Майстар вытворчага навучання ў прафесійна-тэхнічных ці ў сярэдне-спецыяльных установах — гэта не толькі настаўнік, але яшчэ і выхавальнік. Там вучыцца шмат хлопцаў з няпоўных, небагатых сем'яў. І яны патрабуюць асаблівага стаўлення дзеля таго, каб заняць належнае месца ў грамадстве.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Выбары-2016

## ЗАКАНЧВАЕЦЦА АКРЭДЫТАЦЫЯ ЗАМЕЖНЫХ СМІ

### У МЗС ужо даслалі 59 заявак

**Да дня парламенцкіх выбараў застаўся тыдзень «з хвосцікам», да пачатку датэрмінова галасавання некалькі дзён. Традыцыйна прагаласаваць можна будзе не толькі ў краіне, але і за мяжой — калі чалавек знаходзіцца, напрыклад, у службовай камандзіроўцы. Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў, на чарговым брыфінгу паведаміў, што арганізацыя галасавання на замежных выбарчых участках ўскладзена на выбарчыя камісіі, якія там утвораны.**

— Мы, са свайго боку, аказваем усё неабходнае і прадугледжанае заканадаўствам садзейнічанне ў рабоце выбарчых камісій, — адзначыў прадстаўнік дыпламатычнага ведамства. — Разлічваем на тое, што галасаванне пройдзе ў поўнай адпаведнасці з нашым выбарчым заканадаўствам і ўсе грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія за мяжой хацелі б аддаць свой голас на выбарах, атрымаюць такую магчымасць і паспяхова ёю скарыстаюцца на выбарчых участках, арганізаваных на базе дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.

Што да прадстаўнікоў замежных сродкаў масавай інфармацыі, якія хацелі б асвятляць выбары ў нашай краіне, то па стане на 1 верасня ў Міністэрства замежных спраў даслалі 59 заявак на акрэдытацыю.

— Сярод іх прадстаўнікі такіх буйных СМІ, як расійскае інфармацыйнае агенцтва «ТАСС», кітайская тэлерадыёкампанія CCTV, катарскі тэлеканал «Аль-Джазіра», шэраг буйных еўрапейскіх СМІ (напрыклад, нямецкае Duetschlandradio), — пералічыў Дзмітрый Міpончык. — Акрамя гэтага, на пастаяннай аснове ў Беларусі акрэдытавана больш за 270 прадстаўнікоў замежных СМІ. Мы зыходзім з таго, што яны таксама праявяць цікавасць да парламенцкіх выбараў.

Па словах Дзмітрыя Міpончыка, заяўкі на акрэдытацыю журналістаў замежных СМІ для асвятлення выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу МЗС прымае да 4 верасня.

— Таму, не выключаю, а нават мяркую, што да гэтага часу колькасць журналістаў, якія падалі дакументы, можа ўзрасці, — дадаў дыпламат.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## Новая школа ў Нарачы

**«Сёння ў нашай краіне горача любімае, цудоўнае свята. Свята, калі ўсе школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы прымаюць пастаяльцаў на пачатку новага вучэбнага года. Мяркую, што сёлета гэтае свята — 1 верасня — запомніцца вам на ўсё жыццё», — сказаў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр нашай краіны, звяртаючыся да тых, хто прыйшоў на ўрачыстае адкрыццё Нарачанскай сярэдняй школы №2.**

«Сёлета збудавана новая сярэдняя школа на 510 месцаў, — адзначыў старшыня ўрада. — Гэта цудоўны падарунак нашай дзяржавы, які ажыццяўіўся і дзякуючы нашым будаўнікам. З'явілася ўтульная, прыгожая, шматфункцыянальная школа. Упэўнены, што ў гэтых залах, на спартыўным стадыёне вы раскрыеце ўсе свае таленты і падрыхтуецеся да будучага дарослага жыцця».

Кіраўнік саўміна падкрэсліў, што ў нашай дзяржаве ўдзяляецца значная ўвага стварэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы для адукацыі. «Сёлета ўводзяцца дзве сярэднія школы і дзесяць дзіцячых садкоў. За два дзесяцігоддзі збудавана больш за трыста школ і 150 дзіцячых садкоў. У гэтым годзе ў нашай краіне адрамантавана больш за 4000 школ. На гэта выдаткавана амаль 600 мільярдаў недэнамінаваных беларускіх рублёў».

**Сямён ШАПІРА, старшыня Мінскага аблвыканкама**, дадаў, што ў Мінскай вобласці дзейнічаюць 520 школ. «Гадоў 6 таму кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб адраджэнні Нарачанскага краю. За гэтыя гады на нарачанскай зямлі зроблена нямала. Каля 800 мільярдаў недэнамінаваных рублёў укладзена ў сацыяльна-эканамічнае развіццё і ў першую чаргу сацыяльную базу Нарачанскага краю. Гэта школа каштавала нашаму бюджэту 109 мільярдаў рублёў. Сёння краіна ў няпростых умовах эканамічнага развіцця знаходзіць такія грошы, каб вы, паважаныя дзеці, раслі годнымі грамадзянамі сваёй краіны», — сказаў старшыня Мінаблвыканкама, звяртаючыся да вучняў.

Першакласнікам былі ўручаны першыя падручнікі — «Беларусь — наша Радзіма». А з рук прэм'ера школа атрымала два мультыборды.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

*Мінск — Нарач — Мінск.*

■ Парламенцкі дзённік

## АБ'ЯДНАЦЦА, КАБ АДКАЗАЦЬ НА ПАГРОЗЫ СУЧАСНАСЦІ

**З адпаведнай прапановай выступіў у Варшаве віцэ-спікер ніжняй палаты**



**Учора завяршыўся візіт у Польшчу намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктара ГУМІНСКАГА, які прымаў там удзел у сустрэчы спікераў парламентаў дзяржаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы.**

Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты парламента, Віктар Гумінскі выступіў падчас пленарных пасяджэнняў у Варшаве. «Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў заявіў аб неабходнасці аб'яднання намаганняў краін рэгіёна для адэкватнага і эфектыўнага рэагавання на эканамічныя, экалагічныя, гуманітарныя крызісы, геаграфічныя дысбалансы сацыяльна-эканамічнага развіцця, усплёск тэрарызму і іншыя сучасныя пагрозы. Выказаў перакананне ў мэтазгоднасці наладжвання канструктыўнага ўзаемадзеяння паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і ЕС у мэтах фарміравання агульнай эканамічнай і гуманітарнай прасторы ад Лісабона да Уладзівастока», — інфармуе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў.

Віктар Гумінскі адзначыў усё большую і большую ролю нацыянальных парламентаў, міжпарламенцкіх структур і арганізацый у наладжванні і падтрыманні дыялогу па самых вострых пытаннях міжнароднага парадку дня. Ён згадаў аб правядзенні ў 2017 годзе ў Мінску 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, а таксама шэрагу сустрэч парламенцкага вымярэння Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, у якой Рэспубліка Беларусь будзе ў наступным годзе старшынстваваць.

У Сейме Польшчы намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з маршалкам Сейма Марэкам Кухцінскім і віцэ-маршалкам Рышардам Цярлецкім. Бакі абмеркавалі актуальны стан і перспектывы пашырэння беларуска-польскага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, з задавальненнем адзначылі станоўчую дынаміку кантактаў кіраўніцтва парламентаў дзвюх краін.

Прэс-служба інфармуе, што Віктар Гумінскі правёў таксама і шэраг кароткіх двухбаковых сустрэч са старшынямі і намеснікамі старшынь парламентаў такіх краін, як Грузія, Турцыя, Арменія, Азербайджан, Малдова.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

## Менеджмент павінен быць інавацыйным

**У Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Дзень ведаў адзначылі 237 першакурснікаў. Конкурс па некаторых спецыяльнасцях у параўнанні з мінулым годам узрос амаль у два разы. Аб гэтым расказаў рэктар Акадэміі кіравання Марат ЖЫЛІНСКІ.**

— Сёлета да нас прыйшлі вельмі падрыхтаваныя студэнты, — адзначыў Марат Генадзевіч. — Вынікі прыёмнай кампаніі паказваюць, што, па-першае, вельмі шмат алімпіяднікаў, па-другое, у нас дастаткова высокія паўпрахадныя балы. І па некаторых спецыяльнасцях, напрыклад «Дзяржаўнае кіраванне і права», летась конкурс склаў 2,8 чалавека на месца, а сёлета — 4,6. У Акадэмію кіравання прыйшлі першакурснікі, якія хочуць рэалізаваць сябе як кіраўнікі. Прафесарска-выкладчыцкі склад зробіць усё для таго, каб гэта ў іх атрымалася.

Павіншаваць першакурснікаў прыйшоў і **старшыня дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Аляксандр ШУМІЛІН**. Ён адзначыў, што сёння стаіць задача пабудаваць эканоміку ведаў. І без адукаваных людзей гэта зрабіць немагчыма.

— Яшчэ больш важная для краіны задача — якасная падрыхтоўка менеджараў, — лічыць Аляксандр Генадзевіч. — Амерыканская навука паказвае, што 50%, нават 70% любой справы залежыць ад кіраўніка. Сёння Беларусь мае патрэбу ў адукаваных, крэатыўных кіраўніках, якія ўжо думаюць па-новаму, могуць арганізаваць вытворчасць, бізнес і любыя працэсы на новым узроўні. Акадэмія кіравання якраз ажыццяўляецца перападрыхтоўка па інавацыйным менеджменце. Вельмі запатрабаваны напрамак.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Віктар ВАЛЮШЫЦКІ**, як былы выпускнік Акадэміі кіравання, пацвердзіў высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў і адзначыў, што «сёння ідзе якраз той этап, калі Акадэмія заваёўвае сваё належнае месца ў адукацыйным працэсе нашай краіны».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# УРОК ПАМЯЦІ

**Першы тэматычны ўрок «Нам мір завешчана берагчы», які прайшоў учора ва ўсіх навучальных установах краіны, адбыўся і на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Трасцянец»**

**У Дзень ведаў юныя экскурсаводы з 25-й мінскай гімназіі разам з наведвальнікамі мемарыяла прайшліся тымі дарогамі, якія вялі ў небыццё тысячы ахвяр лагера смерці Трасцянец.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Адзін за адным школьнікі расказвалі гісторыю аднаго з найбуйнейшых месцаў масавага знішчэння людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Побач з імі крочылі былыя непаўналетнія вязні, дзеці вайны.

Для Галіны Каржанеўскай гэтая экскурсія была нечым большым. Трасцянец стаў магілай і для яе бацькоў. Такі ж — трагічны — лёс мог спасцігнуць і яе. Гітлераўцы абяцалі немалую ўзнагароду тым, хто выдасць сям'ю аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага падполля. Дарэчы, Мікалай Каржанеўскі — з ліку тых, хто распаўсюджваў «Звязду» ў акупаваным Мінску.

Лёсы канкрэтных людзей, якія абараліся тут, ля Магілёўскай шашы, а таксама тых, каму пашчасціла выжыць у гэтым пекле, знайшлі месца ў аповедах навучэнцаў 25-й гімназіі. Ім, дзецям ужо мірнага часу, вельмі цяжка паверыць, што такі жах адбыўся недалёка ад таго месца, дзе яны ходзяць у школу, сябруюць, кахаюць...

— У нашых дзетак ужо сістэматызаваліся веды пра Трасцянец, мы адкрылі новыя факты, адшукалі біяграфіі некаторых трасцянецкіх ахвяр, — расказала **настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 25 г. Мінска, кіраўнік народнага гісторыка-краязнаўчага музея «Невычэрпная крыніца гісторыі» Аліна ПАХВАЛЁНАЯ**. — Гэта і ёсць высокае патрыятычнае выхаванне. Нашы дзеці павінны ведаць, што адбывалася падчас Вялікай Айчыннай вайны, каб перадаць свае веды іншым. Бо калі гэтая нітка памяці перарвецца, мы як народ будзем знішчаны.

Вядома, можна было б расказаць пра гісторыю Трасцянца і іншых падобных трагедый, якія ўчынілі на нашай тэрыторыі гітлераўцы, як звычайна, у школьным класе. Але толькі так, як прызнаюцца самі школьнікі, яны змаглі прычыніцца да гісторыі беларускага народа. Хоць і трагічнай.



Як перакананa вучаніца гімназіі № 25 горада Мінска, дырэктар музея «Невычэрпная крыніца гісторыі» Яна Канаплёва, чым далей ідзе час, тым усё актыўней мы страчваем памяць аб сваім мінулым. «Калі першы раз мы прыйшлі ў Трасцянец на рэпетыцыю, было вельмі цяжка ўсвядоміць, што на гэтым месцы загінула шмат людзей і такі жах над імі ўчынілі таксама людзі», — прызналася дзяўчынка.

Дакрануцца да гэтай трагічнай старонкі нашай гісторыі цяпер зможа кожны вучань 25-й гімназіі. Кожную сераду падчас гадзіны інфармавання для навучэнцаў установы будзе праводзіцца віртуальная экскурсія. Не забудуцца школьнікі, як і ў гэты раз, пра магчымасць ускласці кветкі там, дзе загінула больш як 200 тысяч бязвінных людзей.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Надвор'е

# СЕЗОН ТУМАНАЎ

**А ў панядзелак сіноптыкі абяцаюць дажджы і месцамі нават град**

**Даволі цёплае і камфортнае надвор'е чакаецца ў Беларусі ў першыя восеньскія выхадныя, паведаміла галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Сёння ўдзень малаактыўны франтальны падзел прынясе ў паўночную палову краіны кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 20 градусаў па поўначы да 26 цяпла па поўдні. У суботу ўначы толькі ў крайніх паўночна-ўсходніх, а ўдзень у паўночна-заходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Увага! Уначы і раніцай месцамі чакаецца сур'ёзны туман. Праўда, на гэты раз нас чакаюць мяккія туманы, бо тэмпература паветра ўначы знізіцца толькі да 7—13 цяпла. Удзень будуць камфортныя плюс 18—25 градусаў.

У нядзелю на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы. Таму ўначы на нядзелю месцамі, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 9—15 градусаў, удзень — 17—24 цяпла, а на поўдні паветра прагрэецца да плюс 25—27 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня яшчэ не абыдзецца без дажджоў, але да сярэдзіны тыдня зноў усталюецца антыцыкланальны характар умоў надвор'я. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі, а ўдзень па паўднёвым усходзе магчымы нават град. У панядзелак і аўторак прагназуюцца ўвогуле анамальна цёплыя ночы, якія звычайна бываюць летам. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак складзе плюс 9—15 градусаў, па поўдні — 16—18 цяпла, удзень прагназуецца плюс 17—24 градусы, а па поўдні прыпячэ нават да плюс 25—28 градусаў.

Не абыдзецца месцамі без кароткачасовых навальнічных дажджоў і ў аўторак. Тэмпература паветра ўначы будзе яшчэ плюс 10—17 градусаў, але па поўначы краіны ўжо знізіцца да 5—9 цяпла. Удзень чакаецца плюс 16—23 градусы. У сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у крайніх паўночна-ўсходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы істотна пахаладае, калі тэмпература паветра складзе толькі 4—10 цяпла, удзень — плюс 17—24 градусы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## У раскладзе — новы польскі цягнік

**З 4 верасня ўзгоднена курсіраванне поезда па маршруце Кракаў — Варшава — Гродна, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.**

Продаж праязных білетаў ужо пачаты. Час адыходу з Гродна — у 15.32, прыбыццё ў Беласток — у 17.08, на станцыю Варшава-Цэнтральная — у 20.15, у Кракаў — у 23.04. Назад з Кракава цягнік будзе адпраўляцца ў 4.46, з Варшавы — у 7.36, з Беластока — у 10.30. На канчатковую станцыю ў Гродне ён прыбудзе ў 14.22. На пачатак верасня кошт праезду (у дэнамінаваных рублях) да Кузніцы складзе 13,33 рубля, да Беластока — 16,39 рубля, да Варшавы — 34,31 рубля, да Кракава — 46,77 рубля.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | | |
| **Продавец** | **ОАО «Локон», г. Гомель, ул. 60 лет СССР, д. 6** | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Диспетчерская** | Здание неустановленного назначения | 8,4 кв.м | 350/С-135708 | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Комсомольская, 3А |
| **Составные части и принадлежности** | Металлические ворота, мастерская (площадь застройки – 66 кв.м) | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,0111 га предоставлен Продавцу на праве аренды до 07.04.2019 для эксплуатации и обслуживания зданий мастерской, диспетчерской и складских помещений | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 12 000,24 BYN (120 002 400 BYR). Снижена на 60%** | | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.07.2016 | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.09.2016 в 14.00 по адресу: г. Гомель, ул. 60 лет СССР, д. 6, ОАО «Локон»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.09.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | | | |


# 949 — ЛІЧБА СВЯТОЧНАЯ

**У гэтыя выхадныя ў сталіцы будзе адзначацца Дзень горада.**

**Вядзецца апошняя падрыхтоўка да маштабнага свята. Аднак што для гасцей і жыхароў сталіцы — забаўка, то для прадстаўнікоў гарадскіх службаў — адказная праца.**



Усяго ў першыя выхадныя восені ў Мінску адбудзецца больш за 90 святочных мерапрыемстваў. Традыцыйна галоўнай пляцоўкай стане тэрыторыя каля Палаца спорту. Яна, як і іншыя месцы масавага збору людзей, будзе ўзята пад кругласутачную ахову. Для таго, каб далучыцца да святкавання, трэба будзе прайсці праз кантрольна-прапускныя пункты. Нельга праносіць ніякія віды зброі, а таксама муляжы, якія яе імітуюць. Уваход на мерапрыемствы забаронены людзям у стане алкагольнага і наркатычнага ап'янення.

Прадстаўнікі ГУУС Мінгарвыканкама просяць мінімізаваць колькасць рэчаў для праносу. Па-першае, з вялікай сумкай вас могуць проста не пусціць на свята, а па-другое, чым менш рэчаў для дагляду будзе ў кожнага, тым хутчэй будзе рухацца чарга на пунктах пропуску. На пляцоўцы каля Палаца спорту будуць устаноўлены камеры захоўвання, дзе можна будзе пакінуць буйную ручную кладзь. На ўсялякі выпадак на мерапрыемствы лепш прыходзіць з паўгадзінным запасам.

Мінскае ДАІ папярэджвае аб змене руху, у тым ліку і грамадскага транспарту, у цэнтры горада 4 верасня ў сувязі з правядзеннем паўмарафону. Жыхарам вуліц Карла Маркса, Камуністычнай і Куйбышава неабходна прыняць свае транспартныя сродкі з праезнай часткі, выезд з двароў падчас правядзення паўмарафону таксама будзе забаронены. Машыны, якія раніцай у нядзелю будуць знаходзіцца на трасе, перамесцяць: прыпаркаваныя па правілах — у суседнія двары, з парушэннямі — на штрафстаянкі. Дарожны рух будзе аднаўлены, калі апошні ўдзельнік паўмарафону дасягне фінішнай рысы. З верасня будзе абмежаваны рух па вуліцы Сталетава, дзе адбудзецца адкрыццё парка экстрэмальных відаў спорта.

**Намеснік начальніка УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй ЗЫРАНАЎ** падкрэсліў, што аўтаўладальнікі, якія хочуць паглядзець у суботу ўвечары піратэхнічнае шоу, павінны прыехаць загадзя і па правілах прыпаркаваць сваю машыну. На вуліцах Няміга і Старажоўская будзе ўстаноўлены строгі кантроль за тым, каб людзі не кідалі свае аўтамабілі на праезнай частцы, жадаючы лепш убачыць салют, бо тым самым яны ўскладняюць рух іншага транспарту.

Супрацоўнікі МНС у сваю чаргу абследавалі асноўныя аб'екты, якія задзейнічаны ў святкаванні, правялі інструктаж работнікаў. Для кантролю за бяспекай на галоўных пляцоўках сфарміраваны нарады. Да Дня горада гатовыя і медыкі. На выхадныя павялічана колькасць персаналу ў прыёмных і рэанімацыйных аддзяленнях, вызвалены дадатковыя ложкі, арганізаваны адміністрацыйныя дзяжурствы. На асаблівы кантроль санэпідэмслужбы ўзятыя аб'екты гандлю і харчавання, а таксама гасцініцы.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zvizda.by*

■ Працяг тэмы

# ЗУБР ВЕРНЕЦЦА Ў ПУШЧУ

**16 жніўня ў нашай газеце расказвалася пра зубра, які пакінуў тэрыторыю Белавежскай пушчы і блукае ў Кобрынскім раёне на мяжы з Украінай.**

Яго бачылі ў Лелікаве, Павіцці, іншых вёсках. Тады ваеннаслужачыя Дзівінскага пагранічнага паста нават званілі ў Брэсцкую абласную інспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету, каб выказаць сваю заклапочанасць тым, што жывёла можа перасячы мяжу і пайсці ў суседнюю краіну.

Прайшло два тыдні, але зубр перадумаў ісці ў блізкае замежжа. Ён прыбіўся да статку кароў недалёка ад вёскі Дзівін. Днём пасецца разам з рагулямі, начам ідзе ў лес. Паводзіць сябе міралюбіва; калі пастухі адганяюць, ён адыходзіць, але недалёка. А так скубе траву ў кампаніі вясковых каровак.

Вёску наведалі спецыялісты Нацыянальнага парку. Паводле іх высновы, зубр небяспечны для свойскай жывёлы, бо здольны нанесці смяротную траўму карове — пераламаць хрыбет. Як паведаміў **старшы навуковы супрацоўнік Аляксей БУНЕВІЧ**, вырашаецца пытанне аб перавозцы зубра назад у пушчу. Пагуляў — і хопіць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# «Захаваць увагу да кнігі...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А вось Дзень беларускага пісьменства — гэта менавіта наша нацыянальнае свята, якое афіцыйна мае статус дзяржаўнага. І найбольшая ўвага на ім — менавіта нашым, беларускім, духоўнасці, асветніцтву, літаратуры, іх адметнасці і непаўторнасці. Сталіца свята штогод перамяшчаецца ў іншы горад: як правіла, гэтыя гарады маюць дачыненне да развіцця нацыянальнай культуры, асветы, кнігавыдання. Іх спіс вялікі: Полацк, Тураў, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаў, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае, Быхаў, Шчучын. Сёлета цэнтрам святкавання стане Рагачоў, адзін з самых старажытных нашых гарадоў. Налета свята будзе прымаць Полацк — у год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, пачатак якому паклалі кнігі палачаніна Францыска Скарыны, іначай і быць не можа.

**«Кліпавае» чытанне на экране камп'ютара не дае чалавеку так званага адчування «плыні», якое ў сучасным грамадстве ў многіх тоеснае з адчуваннем шчасця. Гэта калі чытанне настолькі захапляе, што ты на нейкі момант адлучаешся ад рэальнасці і паглыбляешся ў рэальнасць, выдуманую аўтарам.**

Штогод свята беларускага пісьменства ў гарадах, дзе яно праводзіцца, выконвае не толькі духоўна-асветніцкую функцыю, але і сацыяльную. Стала ўжо добрай традыцыяй, што гэтыя гарады атрымліваюць новы імпульс для развіцця. Да Дня беларускага пісьменства іх добраўпарадкуюць, праводзяцца работы па рэканструкцыі і аднаўленні будынкаў, вуліц і плошчаў, адкрываюцца новыя сацыяльна-культурныя аб'екты...

***— І Рагачоў тут не стане выключэннем. Акрамя добраўпарадкавання, горад атрымае ў падарунак Дом кнігі: у адным будынку размесцяцца кнігарня, бібліятэка і чытальная зала. Наколькі вядома, менавіта Міністэрства інфармацыі стала ініцыятарам адкрыцця ў Доме кнігі кнігарні. Можна лічыць, што пакладзены пачатак яшчэ адной добрай традыцыі?***

— У Рагачове дагэтуль не было спецыялізаванага кніжнага магазіна, і падобнага падарунка гараджане чакалі даўно. Ведаю, што яшчэ да афіцыйнага адкрыцця, якое адбудзецца непасрэдна падчас свята, «Першацвет» (так называецца кнігарня) выклікаў павышаную цікавасць рагачоўцаў і жыхароў раёна. Можна спадзявацца, што будзе яна папулярнай і надалей. Што датычыцца традыцыі... Традыцыяй, на мой погляд, павінна стаць іншае — кніжны магазін павінен быць у кожным райцэнтры, у кожным буйным пасёлку, незалежна ад таго, праводзіцца там якое свята ці не. Калі мы хочам заставацца адукаванай нацыяй, кніга павінна быць у блізкім доступе для кожнага. Міністэрства сумесна з прадпрыемствам «Белкніга» актыўна працуе ў гэтым кірунку.

***— Падчас падрыхтоўкі і правядзення Дня беларускага пісьменства ў калялітаратурных і чытацкіх колах апошнім часам адна з самых папулярных дыскусій — як захаваць увагу да кнігі, да друкаванага слова, што супрацьпаставіць «кліпаваму мысленню», што зрабіць, каб тыя ж кнігарні, бібліятэкі і чытальныя залы не пуставалі...***

— Захаваць увагу тут здольная найперш... сама кніга. Менавіта друкаваная кніга. Даследаванні псіхолагаў і сацыёлагаў, якія праводзіліся апошнім часам, сведчаць: «кліпавае» чытанне на экране камп'ютара не дае чалавеку так званага адчування «плыні», якое ў сучасным грамадстве ў многіх тоеснае з адчуваннем шчасця. Гэта калі чытанне настолькі захапляе, што ты на нейкі момант адлучаешся ад рэальнасці і паглыбляешся ў рэальнасць, выдуманую аўтарам. А вось наколькі кніга здольная захапіць — гэта пытанне выключна таленту пісьменніка.

***— Бясспрэчна, якасць літаратуры застаецца самым важным фактарам для рэальнага або патэнцыйнага чытача. Заахвоціць пісьменнікаў да пошуку цікавых тэм і іх творчага ўвасаблення заклікана была і Нацыянальная літаратурная прэмія, якая летась была ўручана на Дні беларускага пісьменства ўпершыню. Цяпер, калі настаў час падводзіць вынікі другі раз, ці можна сказаць пра тое, што літаратурны працэс ажывіўся, што журы ёсць з чаго выбіраць, што заснаванне падобнай прэміі сябе апраўдала?***

— Сёлета на сем намінацый прэміі было прадстаўлена больш за трыццаць літаратурных твораў розных жанраў. Для невялікай краіны, як наша, ужо тое, што за год з'явілася трыццаць новых твораў, — значны паказчык. А гэта ж не проста творы, а тыя, што могуць прэтэндаваць на найвышэйшую літаратурную ўзнагароду. Пісьменнікі працуюць, творчая пераемнасць не страчана — паглядзіце, колькі цікавых аўтараў з'яўляецца на старонках часопіса «Маладосць». Дый у іншых літаратурна-мастацкіх часопісах — «Полымі», «Нёмане» — рэдакцыйныя партфелі, я ведаю, таксама не пустуюць.

**Традыцыяй, на мой погляд, павінна стаць іншае — кніжны магазін павінен быць у кожным райцэнтры, у кожным буйным пасёлку, незалежна ад таго, праводзіцца там якое свята ці не. Калі мы хочам заставацца адукаванай нацыяй, кніга павінна быць у блізкім доступе для кожнага.**

***— На свята ў Рагачоў сёлета ўпершыню прыедуць прадстаўнікі беларускіх дыяспар амаль з дваццаці краін свету. Для іх рыхтуецца нейкая адмысловая праграма?***

— Паколькі нашы суайчыннікі з далёкага і блізкага замежжа будуць прысутнічаць на Дні беларускага пісьменства ўпершыню, уся праграма свята будзе для іх цікавай і адмысловай. Думаю, што госці з задавальненнем наведаюць Фестываль кніг і прэсы, які разгорнецца ў цэнтры Рагачова, тэматычныя выставы, прысвечаныя пісьменнікам-юбілярам; даведаюцца, як праце аднаўлены друкарскі станок часоў Францыска Скарыны; паглядзяць спектакль «Пясняр», які прывязе драматычны тэатр імя Горкага... А налета, магчыма, мы ўжо зможам вітаць сваіх суайчыннікаў з-за мяжы не як гасцей, а як удзельнікаў свята, бо беларускае пісьменства і ідэі беларускага асветніцтва вельмі актуальныя ў нашых дыяспар за мяжой.

***— Сёлета міжнародны «круглы стол», правядзенне якога — таксама адна з традыцый Дзён беларускага пісьменства, прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, якое будзем адзначаць налета. Тэма яго — «Слова Скарыны ў сучасным свеце». Якія намаганні наша краіна, у тым ліку, зразумела, Міністэрства інфармацыі, прыкладае, каб гэты юбілей набыў сапраўды сусветнае, міжнароднае гучанне?***

— Само правядзенне «круглага стала» з названай тэмай — не што іншае, як прыцягненне ўвагі міжнароднай культурнай супольнасці да асобы Скарыны, значэння яго дзейнасці для беларускай і сусветнай культуры. Плануецца, што ў мерапрыемстве, акрамя беларускіх, прымуць удзел пісьменнікі з 12 краін: Азербайджана, Вялікабрытаніі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Латвіі, Літвы, Расіі, Сербіі, Славакіі,Таджыкістана, Туркменістана. А гэта значыць, што ў гэтых краінах творчая супольнасць ужо дакладна будзе ведаць пра нашу знакавую дату. Паспрыяць гэтаму заклікана і ўнікальная кніга «Францыск Скарына на мовах народаў свету», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». У ёй пад адной вокладкай сабраныя пераклады прадмовы Скарыны да кнігі «Юдзіф» на 64-х мовах свету. Думаю, што гэта не мяжа, і ў юбілейны год можа з'явіцца дапоўненае перавыданне... Увогуле, наступны год юбілейны, і цяпер вядзецца вялікая падрыхтоўчая работа, у тым ліку і з міжнароднымі арганізацыямі (уключаючы ЮНЕСКА), каб 500-годдзе нашага кнігадрукавання было адзначана як важная для ўсёй сусветнай супольнасці дата.

**Пытанні задавала Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
*alena@zviazda.by*

■ Званок на ўрок

# Фізіка з сёмага класа і азы выжывання

## Якія змены з'явяцца ў школьным раскладзе ў новым навучальным годзе

**Пачынаючы з 2 класа, на вывучэнне беларускай і рускай моў будзе адводзіцца аднолькавая колькасць гадзін (незалежна ад мовы навучання ва ўстанове): у малодшых школьнікаў будзе па тры ўрокі рускай і беларускай мовы на тыдзень і па некалькі гадзін літаратуры. Пакуль новаўвядзенне запрацуе толькі ў другім класе, але праз год — у трэцім, а потым і ў чацвёртым. Такім чынам пачатковая школа паступова прыйдзе да аднолькавай колькасці гадзін па беларускай і рускай мовах. Па звестках Белстата, у мінулым навучальным годзе на беларускай мове навучаліся толькі 13,7% ад агульнай колькасці школьнікаў.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

А вось вывучэнне фізікі ў беларускіх школьнікаў будзе распачынацца цяпер на год пазней — з 7-га класа, пры гэтым агульная колькасць вучэбных гадзін, адведзеных на вывучэнне фізікі на II ступені школы, застанецца нязменнай: у 9-м класе будзе ўжо не два, а тры ўрокі фізікі на тыдзень.

Таксама з новага навучальнага года распачнецца паэтапнае ўвядзенне прадмета «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» (АБЖ). У курс увойдуць такія тэмы, як бяспека харчавання, знаходжанне ў месцах адпачынку і масавага збору людзей, рызыкі паводзін і іншыя. АБЖ уводзіцца ў другіх і пятых класах у аб'ёме адной навучальнай гадзіны на тыдзень з унясеннем у расклад вучэбных заняткаў. Адзнакі ў балах па АБЖ выстаўляцца не будуць, хатнія заданні не прадугледжаны. У 3-х, 4-х, 6—9-х класах абавязковае вывучэнне АБЖ працягнецца на факультатыўных занятках. Пераход з факультатыўных заняткаў на навучальны прадмет будзе ажыццяўляцца паступова цягам трох гадоў. Такім чынам, змена статусу АБЖ не павялічыць нагрузку на вучняў.

Вывучаць прадмет «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)», які летась вярнуўся ў школу, вучні будуць таксама без адзнак і хатніх заданняў. У Міністэрстве адукацыі вырашылі, што гэта не той прадмет, дзе патрабуюцца адзнакі ў балах.

Апошняе новаўвядзенне 2016/2017 навучальнага года — абноўленая праграма па прадмеце «Працоўнае навучанне». Цяпер у 6-м класе прадугледжаны 2 гадзіны на тыдзень на вывучэнне гэтага прадмета. Агульная колькасць гадзін не зменіцца, паколькі будзе зменшана колькасць гадзін у 8-м класе (з дзвюх да адной гадзіны). Спецыялісты абяцаюць, што праграмы па гэтай школьнай дысцыпліне стануць больш практыка-арыентаванымі. **Школьнікаў будуць вучыць рамантаваць мэблю, сталярную фурнітуру, карыстацца ручным інструментам, займацца рамонтам электрычнага абсталявання.** Па напрамку «Абслуговая праца» таксама былі ўлічаны пажаданні настаўнікаў і бацькоў. Дзяўчатак навучаць прыгатаванню страў, асновам хатняй гаспадаркі. Усіх, хто пажадае (не толькі дзяўчатак), навучаць, як сервіраваць стол, як правільна падаваць стравы і прымаць гасцей і іншым не менш карысным у жыцці навыкам.

У 2016/2017 навучальным годзе ў адукацыйным працэсе будуць выкарыстоўвацца 14 падручнікаў новага пакалення. А да 2020 года ў Міністэрстве адукацыі запланавана выданне 299 найменняў падручнікаў, з іх 185 — гэта абсалютна новыя выданні. (Сёння ўсе папяровыя падручнікі, якія атрымліваюць дзеці, можна знайсці ў PDF-фармаце на Нацыянальным адукацыйным партале.)

Першая вучэбная чвэрць будзе доўжыцца ў беларускіх школах з 1 верасня па 29 кастрычніка. Другая — з 8 лістапада па 24 снежня. Трэцяя — з 9 студзеня па 25 сакавіка і чацвёртая — з 3 красавіка па 31 мая.

Такім чынам, працягласць асенніх канікулаў складзе 9 дзён (з 30 кастрычніка па 7 лістапада ўключна). Зімой школьнікі будуць адпачываць 15 дзён (з 25 снежня 2016 года па 8 студзеня 2017 года) і вясной — 8 дзён (з 26 сакавіка па 2 красавіка).

Для навучэнцаў першых і другіх класаў у трэцяй вучэбнай чвэрці прадугледжаны дадатковыя зімовыя канікулы (з 13 па 19 лютага 2017 года) агульнай працягласцю 7 дзён.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## У КАНТЭКСЦЕ ЛІТАРАТУРНАГА СЯБРОЎСТВА

**7—11 верасня ў Маскве пройдзе XXIX Маскоўская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Па традыцыі шырокі ўдзел у прадстаўнічай сустрэчы кнігавыдаўцоў і пісьменнікаў з чытачамі прыме і Беларусь.**

Адным з цэнтральных мерапрыемстваў стане міжнароды «круглы стол» «Беларусь: літаратуры краін СНД». Размова літаратараў з Мінска, Масквы і іншых куткоў Садружнасці пойдзе пра прысутнасць беларускай літаратуры ў свеце і нацыянальных літаратур краін СНД у Беларусі. Удзел у размове прымуць дырэктар выдавецтва «Художественная литература» Георгій Прахін, галоўны рэдактар часопіса «Роман-газета» Юрый Казлоў, сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі Валерый Казакоў, паэт Анатоль Усаў, расійскі літаратуразнаўца Казбек Султанаў, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір Андрыевіч, літаратары з Казахстана, Таджыкістана, Азербайджана, Арменіі і іншых краін.

Беларусам ёсць з чым трымаць творчую справаздачу. Апошнім часам выйшла цэлая серыя кніг паэтаў і празаікаў краін Садружнасці ў перакладзе на беларускую мову. А ў Таджыкістане, Казахстане, Азербайджане, Арменіі пабачылі свет кнігі беларускіх аўтараў.

Як падарунак да міжнароднага «круглага стала» ў Маскве — новае выданне кнігі «Францыск Скарына на мовах народаў свету».

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ВОСЕНЬСКІ НАСТРОЙ

## Чатыры фільмы з меланхалічнымі героямі

**Наперадзе тры месяцы восені. Час рызыкоўны, бо можна апынуцца пад уздзеяннем асаблівага настрою — восеньскай меланхоліі. І хоць само слова «меланхолія» спрадвеку фігуравала менавіта ў медыцынскім лексіконе, сёння яна з'яўляецца збольшага не хваробай, а даволі бяспечным станам душы.**
**Я б не раіла яе праганяць, спасылаючыся на словы Арыстоцеля, які казаў, што ўсе выключныя дзеячы, што вызначаюцца ў філасофіі, навуцы кіравання дзяржавай, мастацтве і паэзіі, — відавочныя меланхолікі. Цвярозы розум і грунтоўнасць, магчымасць сузіраць самыя цёмныя, у сэнсе схаваныя, існіны — набор, які старадаўнія даследчыкі прыпісвалі ўздзеянню «чорнай жоўці». Дзеля такога меланхоліі можна паддацца і нават яе падтрымаць. Для апошняга самым бяспройгрышным сродкам з'яўляецца мастацтва, у прыватнасці кіно.**

Меланхолікі — частыя госці ў творах мастацтва. Маркотныя прынцы, якіх не радуюць усе багацці свету, расчараваныя вандроўнікі, Царэўна-Несмяяна, Гамлет, Яўген Анегін, Андрэй Балконскі, у класічным жывапісным каноне — схіленыя персанажы, якія падпіраюць галаву рукой. Не менш яскравыя вобразы прапісаныя ў кінамастацтве. Відавочна, з большым поспехам яны адшукваюцца ў азіяцкім кіно — павольным, сузіральным, удумлівым, але на гісторыю сусветнага кінамастацтва іх прыйшлося таксама нямала. Я прапаную некалькі твораў, у цэнтры якіх схільныя да ўнутранай тугі героі. Часам меланхолія ўтрымліваецца не толькі ў персанажах, але і ў самой тэкстуры фільма. Гэтымі карцінамі можна ў прамым сэнсе натхніцца на цвярозы розум.

## «КАСАБЛАНКА»

### Майкла Кёрціца (1942)

Чорна-белы Галівуд, 1940-я, Хамфры Богарт і Інгрыд Бергман, тры статуэткі Оскар, у тым ліку як найлепшаму фільму, тэма Другой сусветнай вайны. Такая класіка, што класічней няма куды. Кажуць, падчас работы над фільмам ніхто не чакаў, што з яго атрымаецца нешта вартае поспеху, але той прыйшоў. А назву стужкі не маглі прыдумаць да канца здымак, урэшце, як бачым, нічога арыгінальнага і не прыдумалі.

Галоўны герой Рык Блэйн у выкананні Богарта ўтрымлівае ігральны клуб у Касабланцы, дзе суіснуюць фашысцкія сілы і антыфашысцкае супраціўленне. Папулярная ўстанова, можна сказаць, тусовачны цэнтр Касабланкі, жывая музыка, азартныя гульні, сацыяльныя вярхі ў якасці гасцей — і пасярод гэтага абыякавы да жыцця і да палітыкі гаспадар. Здаецца, ён ужо даўно забыўся, што такое эмоцыі, а на пытанне аб нацыянальнасці адказвае: "П'яніца". Па гэтым мужчыне — загадкавым, непрыступным, іранічным — жанчыны толькі ўздыхаюць, але ёнім узаемнасцю не адказвае. Раптам выяўляецца: нешта ўсё ж такі здольна яго ўсхваляваць — прыгажуня Ільза з яго парыжскага мінулага, якая адным вечарам заходзіць у клуб Рыка. Вось і разгадка — непрыкаянасць галоўнага героя з'яўляецца насамрэч любоўнай тугой, адной з разнавіднасцяў меланхоліі.

У «Касабланцы» няма класічнага галівудскага хэпі-энду: здаецца, сваёй жа воляй Рык асудзіў сябе на вечную тугу. Але ён зрабіў правільны выбар. Гісторыя яго ўласнага кахання канчаецца разам з адлятаючым самалётам, што становіцца ахвярай дзеля антыфашысцкага супраціўлення. Ён падумаў за іх абаіх, за іх усіх.



## «БЯГУЧЫ ПА ЛЯЗЕ»

### Рыдлі Скота (1982)

Магічная карціна англійскага рэжысёра Рыдлі Скота і адзін з найпрыгажэйшых навукова-фантастычных фільмаў, які быў да таго ж названы ці не першым прыкладам неа-нуара. У далёкай будучыні насельніцтва Зямлі падзялілася на два класы — людзі і прадукты геннай інжынерыі рэпліканты, якіх чалавецтва перавяло на другарадныя ролі. Былога дэтэктыва Рыка Дэкарда ў выкананні Харысана Форда просяць знайсці групу рэплікантаў, што збеглі з касмічнай калоніі і трапілі на Зямлю.



Абыякавы да ўсяго Рык Дэкард і прыгрэсіўная, але халодная цывілізацыя вакол — фільм «Бягучы па лязе» паказаў разгубленае чалавецтва, якое зайшло ў тупік і, нягледзячы на яркія гарадскія агні і вялікую колькасць забаў, не можа атрымаць галоўнае — сваю існасць, бо розніца паміж чалавекам і рэплікантам аказалася тонкай, як лязо. Рык Дэкард у гэтым кантэксце — меланхалічны антыгерой, што страціў жыццёвыя арыенціры, а «Бягучы па лязе», па сутнасці трылер, выглядае як павольная чароўная антыўтопія. Неверагодны сінтэз.

Ёсць тут і гісторыя кахання, адна з самых дзіўных і прыгожых у кінематографе, — паміж Рыкам Дэкардам і рэплікантам Рэйчал. Дадаём сюды музыку грэчаскага кампазітара Вангеліса, без якой «Бягучы па лязе» — не «Бягучы па лязе», і атрымліваем самыя цудоўныя і чуллівыя сцэны сусветнага кінематографа.

## «ЛЮБОЎНЫ НАСТРОЙ»

### Вонга Кар-Вая (2000)



